СВАБОДА
№7 22—28 лютага 1994 г.
Кошт 50 рублёў

# Рэпрэсіі супраць страйкоўцаў

## Раніцай 22 лютага страйкоўцы зноў зьбіраюцца ў Менску на пляцы Незалежнасьці

**Першым быў арыштаваны старшыня Свабоднага прафсаюзу трактарнага заводу Вячаслаў Козел, які ўзначальвае таксама заводзкі страйкам.**

16 лютага каля 8-й гадзіны раніцы ў кватэру В.Козела прыйшлі два капітаны міліцыі, паказалі санкцыю пракурора Партызанскага раёну С.Грушы і ўзялі пад рукі. Спачатку адвезьлі ў Партызанскі РАУС, потым у пракуратуру і ўжо аб 11-й гадзіне даставілі ў суд, дзе напагатове сядзеў судзьдзя, каб вынесьці пакараньне.

В.Козела абвінавацілі ў трох «злачынствах»: распаўсюджаньне ўлётак з заклікамі да страйку, арганізацыя 15 лютага маніфэстацыі ад трактарнага заводу да Дома ўраду, а таксама правядзеньне яшчэ 12 студзеня на тэрыторыі свайго заводу адкрытага сходу Свабоднага прафсаюзу, што пракуратура назвала «несанкцыяваным мітынгам». В.Козел запатрабаваў, каб яму далі магчымасьць наняць хаця б адваката. Судзілішча было перанесена на наступны дзень.

18 лютага суд Партызанскага раёну прызнаў сп. Козела вінаватым па ўсіх трох пунктах і па кожным прысудзіў максымальна магчымы штраф: 200, 300 і 1000 рублёў.

Можна пасьмяяцца з сумаў штрафу, але зьвернем увагу на сам факт арышту й суда — ўлады імкнуцца запалохаць людзей, каб страйк не пашыраўся, каб народ не выходзіў пратэставаць.

Учора, 21 лютага, у міліцыю выклікалі старшыню Рады страйкавых камітэтаў Міколу Зіміна. Там жвава склалі пратакол «аб арганізацыі несанкцыяванага мітынгу 15 лютага на пл. Незалежнасьці» і адвезьлі Зіміна ў Маскоўскі раённы суд. Дзесяціхвілiннае судовае паседжаньне — і стандартная кара: 300 руб. штрафу.

23 лютага будуць судзіць актывістку Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Марыю Алієву — за ўдзел у тым самым адкрытым прафсаюзным сходзе на трактарным заводзе.

Дырэктар менскага заводу «Транзыстар» выдаў загад аб звальненьні старшыні заводзкага Свабоднага прафсаюзу Міколы Грынчыка.

У Вілейцы распачаты судовы працэс супраць старшыні Свабоднага прафсаюзу заводу «Зэніт» Зьміцера Абразцова і 14 сяброў заводзкага страйкаму — за арганізацыю страйку.

*(Працяг на 2-й стар.)*




ГОД ЗАСНАВАНЬНЯ 1902
ВЫХОДЗІЦЬ З 1990

Галоўны рэдактар
Ігар ГЕРМЯНЧУК

Заснавальнік Павал ЖУК

Выдавец
«Газэта СВАБОДА», Ltd.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220088, Менск,
вул.Іванаўская, 56

## Стабільнасьць коштам 23 даляры

Часам можна пачуць, як прадстаўнікі ўраду выхваляюцца стабільнаю сытуацыяй у краіне. Але ні для кога не сакрэт, што за гэтаю «стабільнасьцяй» хаваецца карупцыя й нежаданьне праводзіць рэформы.

Тымчасам некаторыя разумнейшыя суседзі беларусаў не займаюцца балбатнёю і ня кажуць, што «народ ня вытрымае шокавай тэрапіі», а шпаркім крокам ідуць да рынкавай эканомікі. Іхныя посьпехі відавочныя. Вось трохі статыстыкі.

Урадавая служба цэнаў і канкурэнцыі Летувы нядаўна паведаміла, што сярэдні заробак у 1993 г. у Летуве склаў 291 літ (каля 74 USD), у Латвіі — 71,5 лата (каля 120 USD), у Калінінградзкай вобл. — 115 312 рублёў (94 USD), у Эстоніі — 1200 кронаў (107 USD), а ў Беларусі — 164 973 беларускія рублі, што не перавышае 23 даляраў.

Факты — рэч упартая. Але спадар Кебіч, відаць, нагэтулькі адарваўся ад рэальнасьці падчас сваіх чаўночных паломніцтваў у Маскву, што ня ў стане зразумець краху сваёй палітыкі, згодна зь якой беларусам прапануюць жыць у стабільнай багне вартасьцяй 23 даляры.

**Вінцук ШОСТКА**



**Візыты**

## Наваградак наведалі важныя госьці

**У мінулую суботу ўвесь Наваградак кішэў міліцыяй. Сюды прыехаў у госьці да сястры Старшыня Вярхоўнага Савету Мечыслаў Грыб у суправаджэньні ДАІ й двух машынаў з аховаю.**

Людзі на вуліцах распытвалі адзін аднаго «дзе будзе сустрэча з Грыбам». Аднак генэрал да публікі ня выйшаў.

У гэты ж дзень Наваградак наведала група менскіх рэкеціраў — прыехалі «страсаць даніну». Яны нанесьлі візыты галоўнаму інжынэру завода газавай апаратуры Фядотаву, дэрэктару сельскагаспадарчага тэхнікума Калановічу і некаторым іншым начальнікам.

Кажуць, што рэкеціры ўсталявалі цьвёрдую таксу — 10% ад кошту катэджа. Тых, у каго пабудаваны толькі «нулявы» цыкл, пакуль не чапалі. Менскія «аўтарытэты» разабраліся таксама зь лідарам мясцовай шпаны па мянушцы «Длинный», які адмаўляўся дзяліцца са сталічным рэкетам.

**Г.С.**

# Хто вы, таварыш генэрал?

**На сэсіі Віцебскага абласнога Савету дэпутат Барыс Мацьвееў выступіў з прапановаю высьветліць сапраўдную нацыянальнасьць Мечыслава Грыба.**

Ёсьць зьвесткі, піша ён у дэпутацкім запыце, што «М.Грыб, калі насіў пагоны падпалкоўніка, быў палякам, а як засьвяцілі зоркі палкоўніка, дык вырашыў не выпрабоўваць лёс і запісаўся беларусам».

Акрамя таго, дэпутат Мацьвееў запатрабаваў дасьледаваньня «некаторых грахоў» М.Грыба часоў ягонага кіраваньня віцебскаю міліцыяй. У дэпутацкім запыце Матвееў, у прыватнасьці, падае факт незаконнага атрыманьня сынам Грыба двухпакаёвай кватэры ў Віцебску. Фігуруе таксама гісторыя з будаўніцтвам і продажам дачы на возеры Лосьвіда.

Дэпутат Мацьвееў прапанаваў, каб дасьледаваньнем гэтых ды іншых фактаў занялася дэпутацкая камісія па законнасьці абласнога Савету з далучэньнем работнікаў пракуратуры й міліцыі.

Старшыня абласнога Савету Ўладзімер Кулакоў, на імя якога быў адрасаваны запыт, марудзіць з адказам дэпутату.

**Мікола ГРЫНЯВІЦКІ**

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Рэпрэсіі супраць страйкоўцаў

(Пачатак на 1-й стар.)

Спрабуюць запалохаць нават дэпутатаў Вярхоўнага Савету. Міліцыянт прынёс дахаты дэпутату С.Навумчыку позву з патрабаваньнем 18 лютага зьявіцца ў Ленінскі РАУС да сьледчага. Дэпутат патэлефанаваў, каб высьветліць прычыну. Маёр адказаў, што сп. Навумчык абвінавачваецца ў арганізацыі несанкцыяванага мітынгу 15 лютага каля будынка Вярхоўнага Савету. С.Навумчык надта зьдзівіўся, што міліцыя ня ведае закона аб статусе дэпутата, які дае яму права сустракацца з выбаршчыкамі дзе заўгодна. «Мы — людзі паднявольныя», — заявіў маёр.

Гэткія ж позвы атрымалі некаторыя іншыя дэпутаты Апазыцыі, а таксама шэраг актывістаў БНФ.

Аналягічным чынам дзейнічаюць улады і ў іншых гарадох. Напрыклад, у Віцебску «за арганізацыю несанкцыяванага мітынгу» спрабуюць «прыцягнуць да адказнасьці» дэпутатаў, якія 15 лютага правodзілі сустрэчу з выбаршчыкамі на пляцы Леніна.

Распачатыя таксама ганеньні супраць актывістаў БНФ, якія напярэдадні 15 лютага распаўсюджвалі ў Менску ўлёткі зь інфармацыяй пра маючы адбыцца страйк. Дарэчы, учора, 21 лютага, за распаўсюджаньне ўлётак міліцыянты Партызанскага РАУС затрымалі і завезьлі ў пастарунак пэнсіянэрку Ніну Бязрукаву.

Пятро ПАНКРАТОВІЧ

# Крымінальныя сасіскі

**Партыя аматараў піва 22 лютага ўжо не прывязе на пляц Незалежнасьці гарачыя сасіскі. Адказны сакратар партыі Яўген Багданаў тлумачыць: «па дарозе на пляц сасіскі можа арыштаваць міліцыя».**

У мінулы аўторак улады «прахлопалі» сасіскі, міліцыя пасьпела затрымаць толькі пустую палявую кухню. Яе перахапілі на выезьдзе зь Менска, калі машына ўжо вярталася ў вайсковую частку, дзе «аматары піва» бралі яе ў арэнду. І машыну, і хлопцаў, якія раздавалі сасіскі, у міліцэйскім пастарунку трымалі да ночы — «шылі справу».

У той самы вечар (15 лютага) была ўзбуджана крымінальная справа супраць прадаўцоў крамы №38, што на Юбілейным пляцы ў Менску. А 18-й гадзіне сюды заявіўся сьледчы Маскоўскага РАУС Сяргей Ліхадзіеўскі і склаў абвінавачаўчыя дакуманты «аб парушэньні правілаў гандлю» — за продаж 100 кг сасісак Партыі аматараў піва. На гэтым тыдні справу перададуць у суд. Будзем спадзявацца, што прадаўцоў у турму не пасадзяць. Зрэшты, цяпер яны ўжо не прадаўцы. Адразу ж, на наступны дзень, двое прадаўцоў разам з дырэктарам крамы былі звольненыя з працы.

Рэпрэсіі пагражаюць таксама работнікам сталоўкі, дзе «аматары піва» варылі свае сасіскі і гарбату.

Мікола ГРЫНЯВІЦКІ

# Эфір забаронены

**19 і 20 лютага слухачы другой праграмы радыё не дачакаліся выхаду ў эфір радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». Яна была забароненая «па вусным загадзе» шэфа тэлерадыёкампаніі А.Сталярова.**

Гэта здарылася пасьля таго, як раніцай 19 лютага ў наўпроставым эфіры «Беларуская маладзёжная» паведаміла навіны, якія прыйшліся не дaспадобы чыноўнікам Саўміну. У прыватнасьці, дэпутат ВС Уладзімер Новік сказаў у эфір, што «Масква пагаджаецца на аб'яднаньне грашовых сыстэмаў толькі пры ўмове палітычнага ўваходжаньня Беларусі ў склад РФ».

У гэтай жа перадачы «Беларуская маладзёжная» паведаміла пра рэпрэсіі супраць страйкоўцаў, а таксама дала фрагменты прэс-канфэрэнцыі забароненага напярэдадні Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў.

Наступныя два выхады ў эфір былі забароненыя. Замест інфармацыі на хвалях «БМ» гучала толькі музыка. Аналягічным чынам быў забаронены наўпроставы эфір 15 лютага, калі «Беларуская маладзёжная» зьбіралася апэратыўна паведаміць інфармацыю пра страйкавыя падзеі на Беларусі. «Круціце музыку», — быў загад.

Учора «БМ» выйшла ў эфір. А сёньня, магчыма, зноў будзе гучаць музыка.

Пятро ПАНКРАТОВІЧ

# Інтрыга на зьезьдзе «зялёных»

24 дэлегаты ІІ зьезду Партыі зялёных, які адбыўся мінулае суботы ў Гомлі, склалі свае мандаты ў выніку згулянай па ўласнай ініцыятыве інтрыгі вакол «статутнага парушэньня». Інцыдэнт зь вялікаю нацяжкаю можна назваць расколам.

Неруш-прэс

# Мечыслаў Грыб паклікаў масажыстку

**57-гадовы генэрал Грыб будзе цяпер падтрымліваць форму з дапамогаю масажысткі.**

Як толькі Мечыслаў Грыб засяліўся ў службовыя апартамэнты Старшыні ВС, адразу было пастаўлена пытаньне аб адкрыцьці яшчэ аднаго габінэта — масажнага.

За часамі кампартыі такі габінэт у будынку ЦК КПБ працаваў спраўна. Аднак пасьля таго, як сюды пераехаў С.Шушкевіч, габінэт быў прыкрыты, а масажыстку адправілі працаваць у «лечкамісію». Цяпер усё вяртаецца.

Абслугоўваць Мечыслава Грыба будзе Ала Махнач. Яна працавала тут і раней, рабіла штодзённы масаж першым сакратарам ЦК КПБ Яфрэму Сакалову і Анатолю Малафееву. Будзем спадзявацца, што яна ня страціла кваліфікацыі і генэрал Грыб будзе задаволены ейнаю працаю.

М.Г.

# Партыйная камандзіроўка

**У суботу, 19 лютага, у Сьветлагорск завітала група менскіх камуністаў на чале з дэпутатам В.Ціхінем.**

На сустрэчу зь імі ў Палацы культуры мясцовыя ўлады сабралі пару соцень вэтэранаў. Вёў рэй старшыня гарвыканкаму А.Якабсон (таксама дэпутат ВС).

Таварыш Ціхіня паведаміў публіцы, што ў нас працуе перакупачна-спэкулятыўны капітал і што «в этом виноваты политические авантюристы типа Шушкевича». Ён таксама пераконваў прысутных, што «БНФ агонизирует, как раненый зверь» і што ўвосень, калі будуць новыя выбары, нельга дапусьціць, каб «к власти пришли борщевские и трусовы».

67-гадовы дэпутат М.Качан (сакратар Партыі камуністаў Беларусі) паабяцаў, што яны разам з таварышам Кебічам зробяць усё, каб уратаваць рэспубліку.

Доўга гаварыла Наталя Машэрава, «дочь национального героя Белоруссии и главный редактор «Новой народной газеты». Яна сказала, што «наша газета начнёт выходить через 2—3 недели и будет издаваться 100-тысячным тиражом».

Апошнім зь візытантаў выступіў нехта Ўладзімер Гурын, які назваўся «аппаратчиком Славянского Собора». Ён абвесьціў пра стварэньне «молодёжной организации «Славянские соколы».

Прысутныя былі расчараваныя, бо ім абяцалі, што на сустрэчу прыедзе нардэп Лукашэнка. Іх супакоілі: «Таварыш Лукашэнка приедет да вас праз 2—3 тыдні, а сёньня ён выступае ў Віцебску». Частка вэтэранаў абурылася: «А чаму нам не далі выступіць?!» Аднак госьці ўжо пайшлі «адзначаць камандзіроўку».

Барыс РАМАНОЎСКІ

# За генэралам — генэрал

**У Вярхоўным Савеце Беларусі дэпутаты з пагонамі ў цане. Двое зь іх бліжэйшым часам зьбіраюцца заняць вакантныя пасады ў Прэзыдыюме ВС.**

На пасаду старшыні Камісіі па сродках масавай інфармацыі і правох чалавека плянуецца прызначыць палкоўніка міліцыі дэпутата С.Давідовіча. Гэтае мейсца пуставала з таго часу, як яго вызваліў Іван Каратчэня, які стаў шэфам апарату СНД.

На пасаду старшыні Камісіі па абароне і нацыянальнай бясьпецы, якую ўзначальваў М.Грыб, мяркуецца прызначыць генэрала А.Новікава — галоўнага «палітрука» былой Беларускай вайсковай акругі, які цяпер займае аналягічную пасаду ў Міністэрстве абароны. Ён патрапіў у дэпутаты ВС па квоце вэтэранскай арганізацыі. Ягонае прозьвішча фігуравала сярод тых, хто ажыцьцяўляў на Беларусі ўказаньні ГКЧП (жнівень 1991 г.).

Кандыдатуру Новікава на пасаду старшыні камісіі прапанаваў Грыб. Гэта было на паседжаньні Прэзыдыюму ВС 18 лютага. Супраць выступіў Ніл Гілевіч. Ён заявіў, што на пасаду старшыні «такой камісіі» нельга прызначаць чалавека, рускага па нацыянальнасьці. Гілевіч лічыць гэта небясьпечным, «асабліва цяпер, калі на нашай тэрыторыі знаходзяцца расейскія войскі». Аднак Прэзыдыюм параіў Гілевічу «не разжигать межнациональную рознь» і аднадушна пастанавіў рэкамэндаваць «товарища Новикова».

«Няма ніякага сумневу, што Вярхоўны Савет прагаласуе за «товарища Новикова», — заявіў адзін з дэпутатаў-апазыцыянэраў. — У іх цяпер толькі адна надзея — на войска, у тым ліку расейскае, і на міліцыю».

Іван СІДАР

# Вэтэраны дэманапалізуюцца

Абражаныя прасавецкімі антыадраджэнскімі выказваньнямі і ўчынкамі кіраўнікоў вэтэранскай арганізацыі, гарадзенскія пэнсіянэры вырашылі стварыць сваю, альтэрнатыўную, у якой бы шанаваліся нацыянальныя беларускія каштоўнасьці. У новаўтвораны арганізацыйны камітэт тут жа затэлефанаваў абураны старшыня абласной вэтэранскай арганізацыі народны дэпутат Сасноўскі і выказаў літаральна наступнае: «Вы не имеете права. Прекратите! У нас монополия на ветеранскую организацию. Вас всё равно не зарегистрируют, потому что нужно иметь республиканскую структуру... Я вас предупреждаю: если не прекратите, будем подавать в суд. За моральный ущерб вы нам заплатите больше миллиона рублей. Мы в этом имеем большой опыт».

«Гродзенская праўда» тым часам зьмясьціла гутарку з заснавальнікамі новай арганізацыі. Кіраўніцтва абласнога савету «афіцыйнай» арганізацыі вэтэранаў абурылася, і пад загалоўкам «Ветераны разберутся сами» газэта мусіла надрукаваць пратэст, падпісаны, апроч сп. Сасноўскага, таксама дэпутатамі РБ Караўкам, Крупнікам, Барсуковым, Сарокіным і сп. Абросімавым. Вось цытата адтуль: «Просматривается деятельность некоторых лиц внести раскол в организацию ветеранов, ввести в заблуждение общественность». Рэзюмэ наступнае: «Альтернативной организации ветеранов Республики Беларусь нет и быть не может».

Па-камуністычнаму хвацка! Атрымліваецца, што і сёньняшняму камсамолу за прыкладам старэйшых неабходна выдаць заяву аб манаполіі на права ядналь моладзь. А сытуацыя для СМБ сапраўды «небясьпечная». Апроч студэнцкіх, скаўцкіх ды іншых, у Горадні, прыкладам, нядаўна створаны Саюз Сельскай Моладзі. Цяпер камсамольцам давядзецца заняцца судовай дзейнасьцю, а філятэлістам судзіцца зь філяфаністамі й нумізматамі, аматарам катоў і котак — з уладальнікамі бульдогаў і аўчарак. А як жа інакш? Манаполія дык манаполія.

Улады рэагуюць на канфлікт. На сэсіі абласнога Савету 4 лютага была скасаваная пасада кансультанта па справах вэтэранаў пры старшыні абласнога Савету (якую займаў вышэйзгаданы спадар Сасноўскі). Але ж у горадзе «афіцыйныя» яшчэ з камуністычных часоў маюць 4 платныя стаўкі. Давядзецца цяпер дзяліцца з новаю беларускаю вэтэранскаю арганізацыяй. У Горадні ў яе ўжо запісалася каля 100 чалавек. Зараз, каб стварыць агульнабеларускую арганізацыю, патрэбныя філіі ў іншых гарадох. Таму ініцыятары запрасілі далучацца ўсіх ахвотных і далі кантактны тэлефон у Горадні — 45-45-01.

Віктар МАСКАЛЁЎ

**За кадрам**



**Першая ледзі краіны Алена Кебіч у кампаніі з мужам і целаахоўнікам.**



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## Дом Домаша

**Пасьля забойства Дз.Арцымені, які ня меў ахоўніка, вельмі надзённым стала пытаньне аховы першай службовай асобы Гарадзенскай вобласьці.**

Сёньняшні старшыня абласнога савету Сямён Домаш займае зь сям'ёй з 4-х асобаў чатырохпакаёвую кватэру на другім паверсе звычайнага гарадзкога дому. Перад пад'ездам у аўтамабілі стала дзяжурыць ахова, прычым у нядаўнія маразы ёй даводзілася моцна мерзнуць.

Як стала вядома карэспандэнту СВАБОДЫ, неўзабаве С.Домаш зьменіць хатні адрас. На вуліцы Лермантава вызваліўся дом даваеннай пабудовы. У ім месьціўся гатэлік в/а «Азот», але апошнім часам яго ўтрыманьне абцяжарвала прадпрыемства, палова вытворчасьці якога спынена. Як сьведчыць камунальная служба, сёньня ў доме цячэ дах, падгнілі кроквы. Па нашых зьвестках, С.Домаш жадае зрабіць рамонт уласным коштам, а сваю прыватызаваную кватэру прадаць выканкаму паводле дзяржаўных расцэнак.

Сям'я старшыні аблсавету будзе жыць на першым паверсе, жылая плошча якога складае 78 кв. мэтраў. Зьверху, у мансардзе, куды ёсьць асобны ўваход, разьмесьцяцца ахоўнікі КДБ.

## Віват, Касьцюшка!

**16 лютага Гарадзенскі гарвыканкам прыняў рашэньне «Аб падрыхтоўцы й правядзеньні 200-х угодкаў Вызвольнага паўстаньня 1794 г.».**

Будзе ўсталяваная мэмарыяльная дошка на Каралеўскім палацы, дзе мясьцілася Паўстанцкая Парадкавая Камісія і дзе 30 верасьня 1794 г. адбылася вайсковая нарада пад старшынствам Тадэвуша Касьцюшкі. У абласным гістарычна-краязнаўчым і школьных музэях адчыняцца экспазыцыі, прысьвечаныя гісторыі паўстаньня. Дзьве вуліцы й гарадзкі пляц набудуць імёны паўстанцкіх кіраўнікоў — Т.Касьцюшкі, Якуба Ясінскага, Міхала Агінскага. Ва ўсіх сярэдніх і вышэйшых вучэльнях з нагоды 200-х угодкаў пройдуць канфэрэнцыі ды сходы. У часе сьвяткаваньня будзе ладзіцца мастацкая выстава, выйдзе адпаведны «касьцюшкаўскі» плякат. Нарэшце, гарадзенскія навукоўцы возьмуць удзел у нацыянальнай юбілейнай канфэрэнцыі, якая адбудзецца ў Косаве.

**Сяргей АСТРАЎЦОЎ**

# Абяцанага тры гады чакалі. І не дачакаліся

**За гады савецкай улады сярод беларускай кіроўнай намэнклятуры склалася моцная традыцыя абяцаць і падманваць.**
**Яскравым прыкладам таго, што сацыялістычны лад кіраваньня на Беларусі не адышоў яшчэ ў нябыт, ёсьць гісторыя з пагашэньнем аблігацыяў дзяржаўнай мэтавай беспрацэнтавай пазыкі СССР 1990 г.**

Нагадаю: амаль чатыры гады таму ўрад Савецкага Саюзу выпусьціў згаданыя каштоўныя паперы, паабяцаўшы да 1995 г. ашчасьлівіць уладальнікаў дэфіцытнымі таварамі: тэлевізарамі, лядоўнямі, легкавымі аўтамабілямі ды г.д. Даверлівых людзей тады ў нашай рэспубліцы было шмат, нават болей, чым мелася аблігацыяў. І на многіх прадпрыемствах і ва ўстановах прыгожыя «абяцанкі» вылучылі толькі самым заслужаным працаўнікам: перадавікам вытворчасьці, вэтэранам, інвалідам вайны... Людзі гэтыя пераважна лішніх грошай ня мелі, таму выкуплялі аблігацыі, пазычаючы ў сваякоў і знаёмых, спадзеючыся, што хоць праз гады два ў іхнай хаце зьявіцца запаветны тэлевізар ці лядоўня. Іншага шанцу набыць гэтыя неабходныя рэчы ў іх не было — рынкавыя цэны ўжо тады «кусаліся».

Таксама вялікія спадзяваньні на абяцанкі партыі й ўраду ўскладвалі й уладальнікі аўтамабільных аблігацыяў. Хоць па тым часе і дзяржаўны кошт «Масквіча» ці «Запарожца» быў немаленькі, але ўсё ж больш-менш даступны простаму рабочаму ці службоўцу, якія дзеля ажыцьцяўленьня аўтамабільнай мары згодныя былі год-другі весьці самы аскетычны лад жыцьця. Словам, як ужо не аднойчы было ў гісторыі савецкай дзяржавы, ейныя шматпакутныя грамадзяне зацягнулі тужэй папругі, кінулі ўсе свае зьберажэньні на выратаваньне сацыялістычнай эканомікі і... засталіся ў дурнях.

Напрыканцы 1991 г. Савецкі Саюз разваліўся, а ў новых-старых кіраўнікоў сувэрэннай Беларусі аб даўгох рыжкоўска-паўлаўскага ўраду галава не балела. Хаця злашчасныя аблігацыі на тэрыторыі нашай рэспублікі распаўсюджваліся на распараджэньне габінэту міністраў Вячаслава Кебіча. Праўда, праз пэўны час беларускі Саўмін вырашыў усё ж аплаціць саюзныя аблігацыі і 6 красавіка 1992 г. прыняў пастанову «Аб дзяржаўных каштоўных паперах былога СССР». Згодна з гэтым дакумэнтам аблігацыі выкупляліся паводле намінальнай вартасьці, павялічанай на 40%. У дадатак Саўмін абавязаўся выплаціць беларускім крэдыторам былога СССР яшчэ 15% гадавых.

Аднак такі «крок насустрач» ня выклікаў хвалі ўдзячнасьці ў гаспадароў-уладальнікаў. Наадварот, яны сустрэлі гэты ўрадавы дакумэнт з абурэньнем. І ня дзіва, бо саўмінаўскай кампэнсацыі тады хапіла б хіба што на дзьверы ад лядоўні. Мяркуйце самі: уладальнік аблігацыі на аўтамабіль «Волга» заплаціў у 1990 г. за каштоўную паперу 16 тысяч рублёў. Велізарныя па тым часе грошы! А чаго вартая гэта сума, нават памножаная на 40% кампэнсацыі? Што можна было ў верасьні—сьнежні 1992 г. купіць за 20—25 тысяч рублёў? Пару аўтамабільных колаў. Натуральна, што людзі пачалі пратэставаць супраць такога падману.

Іх не суцешыла і чарговае рашэньне ўраду падвысіць кошт аблігацыяў у 5 разоў. На момант прыняцьця адпаведнай пастановы інфляцыя імчэла па Беларусі са значна большаю хуткасьцю і саўмінаўскай кампэнсацыі ўжо не хапала ні на дзьверцы ад лядоўні, ні на кола ад аўтамабіля. Зноў кінуліся небаракі абіваць парогі Дома ўраду і будынка Вярхоўнага Савету, але марна. Выплочваць даўгі спаўна кіраўніцтва Беларусі ўладальнікам аблігацыяў не згаджалася. І многія зь іх праз пэўны час стаміліся змагацца за свае зробленыя грошы.

Па зьвестках Міністэрства фінансаў, зараз на руках нашых суайчыньнікаў засталося ўсяго каля 3 працэнтаў аблігацыяў. Але сьвяткаваць канчатковую перамогу над уласным народам ураду яшчэ рана. Тыя гаспадары аблігацыяў, што не здаліся (у асноўным гэта ўладальнікі каштоўных папераў на набыцьцё аўтамабіляў) ўсё ж не зьбіраюцца дараваць дзяржаве свае зьберажэньні. Гэтыя людзі стварылі нават свой «аргкамітэт па абароне грамадзянаў Рэспублікі Беларусь ад узаконенага Саўмінам рабаваньня ўладальнікаў беспрацэнтных мэтавых аблігацыяў 1990 г.»

У гэтым арганізацыйным камітэце каля пяцідзесяці чалавек. За словамі лідараў, неўзабаве уладальнікі аблігацыяў маюць намер яшчэ раз зьвярнуцца да кіраўнікоў парляманту й ураду з просьбаю атаварыць аблігацыі альбо цалкам кампэнсаваць іхны кошт. Калі ж і гэтыя просьбы будуць праігнараваныя, падманутыя людзі спадзяюцца абараніць свае інтарэсы ў Вярхоўным судзе Беларусі, прад'явіўшы адпаведны пазоў прэм'ер-міністру і сьпікеру.

Зрэшты, захады ўладальнікаў аблігацыяў больш нагадваюць крок адчаю, чым нейкія дзейсныя меры. Нашыя ўлады, як вядома, ігнаруюць законныя патрабаваньні тысяч людзей. А тут усяго нейкія пяцьдзесят уладальнікаў аблігацыяў.

Так што не сумнявайцеся, чарговая перамога будзе за ўрадам. Пірава перамога.

**Адам РОЎДА**

## Камэнтар народнага дэпутата Беларусі Ўладзімера Новіка:

Пытаньне «Аб аблігацыях дзяржаўнай мэтавай беспрацэнтавай пазыкі СССР 1990 г. на тавары народнага спажываньня» я спрабаваў уключыць у парадак дня 12-й сэсіі Вярхоўнага Савета. Таксама рабіў запыты да ўраду аб вяртаньні дзяржаваю даўгоў сваім грамадзянам з трыбуны Вярхоўнага Савету на 13-й сэсіі. Усё дарэмна.

У адказе на мой апошні запыт наконт аблігацыяў міністар фінансаў Сьцяпан Янчук, у прыватнасьці, паведаміў мне, што: «дадзеная пазыка была выпушчаная былым СССР. Атрыманыя ад яе сродкі былі пералічаныя ў саюзны бюджэт. Спробы кіраўніцтва Беларусі атрымаць ад Расейскай Фэдэрацыі неабходныя для выдачы ўладальнікам аблігацыяў тавары альбо эквівалентныя (з улікам інфляцыі) грошы посьпеху ня мелі».

Вось такое саўмінаўскае «алібі» — маўляў, я ня я й пазыка не мая. Відаць, забыўся Сьцяпан Янчук і ягонае непасрэднае начальства, што менавіта кабінэт міністраў Кебіча дапамагаў савецкаму ўраду распаўсюджваць на Беларусі вышэйпамянёныя аблігацыі й таму нясе поўную адказнасьць перад сваім народам за пагашэньне гэтых каштоўных папераў.

Дарэчы, некаторыя тавары, пад якія выпушчана большасьць аблігацыяў, вырабляюцца на беларускіх прадпрыемствах (напрыклад, лядоўні й тэлевізары), таму пры жаданьні ўрад мог бы знайсьці магчымасьць аддаць гэтыя даўгі. А што да аўтамабільных аблігацыяў, то іхным уладальнікам можна й трэба было б цалкам выплаціць грашовую кампэнсацыю, каб чалавек мог купіць доўгачаканае аўто па цяперашніх цэнах. У крайнім выпадку аблігацыі можна пераўтварыць і ў пэўную долю прыватызацыйных чэкаў.

Наш Саўмін, аднак, па старой камуністычнай звычцы выбраў традыцыйную адгаворку — спасылаецца на недахоп сродкаў. Але разам з тым урад без асаблівых цяжкасьцяў дамогся ад Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету і Нацыянальнага банку вылучэньня 2,8 трлн. руб. на падтрымку калгаснага ладу (дарэчы, гэта азначае павесіць на кожнага жыхара Беларусі доўг у памеры 280 тыс. руб.), хаця ёсьць сумневы ў тым, што гэтыя грошы дойдуць да сапраўдных вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Хутчэй за ўсё, большая частка гэтых нічым не забясьпечаных крэдытаў праз складаную разьмеркавальную сыстэму аграпрамснабаў, аграпрамбанкаў і падобных установаў пойдзе на ўмацаваньне бюракратычнага апарату, што сядзіць на шыі вытворцаў. Як вядома, сельскагаспадарчая намэнклятура — гэта апірышча камуністычнага «раю» на Беларусі, прыхільнікам і будаўніком якога выступае ўрад Кебіча. Вось бы так Кебіч клапаціўся пра сваіх простых грамадзянаў, якія даверылі дзяржаве ў 1990 г. не паветраныя, а сумленна зробленыя імі грошы.




**ПОШТА**

# МАФІЯ БУДЗЕ СМУТКАВАЦЬ ПА ЎРАДЗЕ КЕБІЧА

Калі паслухаць Кебіча, дык хутка (вось-вось ужо, калі, вядома, не перашкодзяць страйкі), мы сягнем сьветлай будучыні. Дзякуй таварышу Кебічу за добрыя спадзяваньні.

Але відавочна іншае — беларускія грамадзяне жывуць горш за афрыканцаў. Кожны можа перавесьці сваю зарплату ў даляры. І што ён атрымае? Сярэдне каля 20 даляраў. У Афрыцы прыйдзецца доўга шукаць працу, за якую б так мала плацілі.

У Летуве, Латвіі, Эстоніі зарплата ў некалькі разоў вышэйшая і крамы забітыя таварамі. У заўсёды жабрацкай Расеі зарплата складае каля 80 даляраў — вышэйшая за нашую ў чатыры разы. Кажуць, што ў іх рэсурсы. Але Расея самыя каштоўныя свае рэсурсы пампуе за мяжу праз Беларусь. За гэта яна дае нам мізар, які, тым ня менш, урад наш не ўключае ў дзяржаўны бюджэт. Тымі мільярдамі валюты, якія дастае Беларусь за транзыт, распараджаюцца ўрадавыя і нафтагазпрамаўскія чыноўнікі на сваё жаданьне. Як адзначылі на сэсіі Вярхоўнага Савету, гэтая сума складае дзесяць працэнтаў гадавога бюджэту Беларусі. Для Расеі — мізар, а для чыноўнікаў — добры навар. Як яны імі распараджаюцца — аднаму Богу вядома, ды яшчэ, напэўна, некаторым расейскім спадарам, якіх, відаць, ня крыўдзяць.

Вось у такія вялізныя шчыліны, як транзыт, бартар, дзяржаўны гандаль, які ўсё больш становіцца ценявою структураю, развалены Аграпрам, і прасыпаецца наш з вамі дабрабыт. І застаемся мы ля разьбітага карыта.

Сёньня гэтулькі рэальнай улады, колькі ёсьць у Кебіча, маюць два чалавекі: Кім Ір Сэн і Фідэль Кастра. У нас, гэтаксама як і ў Карэі, і на Кубе, урад кантралюе газэты, радыё, тэлебачаньне.

Але замацаваць гэтую ўладу можна, толькі стаўшы прэзыдэнтам. І Кебіч пачаў сваю перадвыбарчую кампанію. Працуе тэлебачаньне і ўсе радыёстанцыі Рэспублікі Беларусі! Слухайце мудрыя прамовы таварыша Кебіча. Ён абяцае ўсё, пра што толькі ні заікніся. Ён абяцае нам больш, чым абяцаў расейцам Жырыноўскі, нават прыцягнуць войска для барацьбы са злачыннасьцю.

Аднак калі Кебіч стане прэзыдэнтам, то чаму нешта павінна зьмяніцца? Што, салдаты перамогуць мафію? Хіба некаму не зразумела, што карупцыя пачынаецца з вышэйшых чыноўнікаў, што прыгрэліся пад крылом правадыра? Камэрсанты стануць плаціць больш падаткаў? Яны і гэтых ня плоцяць, бо падаткі шалёныя. Яны плоцяць хабар мафіі, і мафія павінна дзякаваць за высокія падаткі таварышу Кебічу, пад чыім кіраўніцтвам распрацаваная такая падатковая сыстэма. Мафія расьце й квітнее. Ці то з дурасьці, ці то зь некампэтэнтнасьці, ці можа яшчэ зь нейкіх прычынаў менавіта ўрадавыя дзеячы сталі хроснымі бацькамі нашай мафіі. Калі гэты ўрад пойдзе ў адстаўку, мафія аб'явіць жалобу.

**Вячаслаў СУРЖЫЦКІ,**
**інжынэр**

Менск



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



*Зьбігнеў СЬВЕНХ*

# Закляцьце Казімера Ягайлавіча

*Пачатак у №№1—6*

Лаўрын Гуцэвіч, дойлід, прафэсар архітэктуры, тапаграфіі і геаграфічных картаў у Галоўнай літоўскай школе і вайсковай школе пры ёй у Вільні, другі з чатырох сыноў Сымона Гуцэвіча-Стокі, зьявіўся на сьвет у Міганцах Вількамірскага павету, хрышчэньне прыняў і да ліку жывых далучаны ў Палавені 5 жніўня 1753 г.

Правёўшы немаўлячыя гады пад бацькоўскаю страхою, Лаўрын пачатковыя веды набыў у парафіяльнай школе ў Купішках; далейшую ж навуку два гады асільваў пры касьцёле ў Палавені.



**Фасад Віленскай Катэдры** *(рысунак Я.Рустэма)*

Заўважыўшы ў натхнёнага падлетка ахвоту да вучобы, бацька й сябры вырашылі паслаць яго ў павятовую школу аа. піяраў у Панявеж; там, ужо сам зарабляючы, хлопец правёў пяць гадоў і, можа, назаўсёды там бы і застаўся, бо меў такое пакліканьне. Але ў наступным годзе бацька, якому пажар зьнішчыў увесь маёнтак, забраў сына са школы і пажадаў яго мець пры сабе за памочніка. Падуладны волі бацькоўскай, але ня здольны заспакоіць у сабе жаданьне дасканаліць моц душэўную, Лаўрын, нарэшце, выпрасіў у расчуленага бацькі дазвол на ледзьве не выжабраную дапамогу паступіць у Галоўную віленскую школу.

Апынуўшыся між чужымі, ён быў пазбаўлены магчымасьці ўтрымацца пры школе. На час суцішыў свае мары, надзеў манаскую сукню і два з паловай месяцы ў кляштары аа. місыянэраў рыхтаваўся да духоўнага сану. Адначасна руплiва займаўся сьвецкімі навукамі. Неўзабаве гэтую стараннасьць Гуцэвіча заўважыў на публічных іспытах у 1775 г. сьв. пам. князь Масальскі, біскуп віленскі, тагачасны старшыня Адукацыйнай Камісіі, і перавёў яго ў дыяцэзійную сэмінарыю. З надзвычайнаю ахвотаю Лаўрын пачаў вучыцца архітэктуры ў Кнафуса, адзінага на той час дойліда ў Літве, які якраз будаваў палац у Верках і акурат скончыў некалькі будынкаў у горадзе.

Ветлівым абыходжаньнем у таварыстве і выдатнымі посьпехамі ў навуках Гуцэвіч заслужыў княскую ласку, меў штораз лягчэйшы доступ да яго асобы, а таму аднаго разу ў часе даверлівай размовы з біскупам прызнаўся, што да духоўнага сану ня меў ніколі шчырага пакліканьня і быў бы рады зьмяніць свой стан, каб цалкам аддацца навукам сьвецкім. Біскуп Масальскі дазволіў гэта і, зыходзячы са схільнасьцяў і здольнасьцяў Гуцэвіча, які ў архітэктуры бачыў сэнс усяго свайго жыцьця, прыняў яго ў свой двор і стаў рыхтаваць адпаведнае яму месца. Маючы намер і абавязак перабудаваць катэдральны касьцёл у Вільні і едучы ў 1778 г. за мяжу, узяў яго з сабою дзеля знаёмства з замежнымі краінамі і агляду славутых пабудоваў. Лаўрын пабываў у Караляўцы, Гданьску й Бэрліне. У Гамбургу пазнаёміўся з таемнымі навукамі. Потым жыў у Капэнгагене, Любэку і Брэмэне, ажно пакуль яго князь не адклікаў у Парыж. Тут ён быў бы паглынуты, не раўнуючы як кропля, каб зноў жа не апякунская рука князя...

Перапынім на хвілю гэтую прамову-дыямэнцік Караля Падчашынскага, на пакаленьне маладзейшага калегі Гуцэвіча, што чыталася на публічным паседжаньні імпэрскага Віленскага ўнівэрсытэту (гэтак у арыгінале за 15 верасьня новага стылю 1823 г.), і абяцаем вярнуцца да жыцьцяпісу Гуцэвіча, зьдзейсьненага ў калярытным стылі эпохі. Тымчасам аддамо слова нястомнаму сьвятару Яну Курчэўскаму, які здолеў справу Гуцэвічаву апісаць больш ясна й ляпідарна.

Аднаўляючы Катэдру паводле свайго пляну, Гуцэвіч нічога не зьмяніў у нутраным яе ўбранстве, а толькі адрамантаваў пашкоджанае скляпеньне ў капліцы Марыі і пабудаваў на ўзор капліцы сьв. Казімера трохпавярховую закрыстыю на супрацьлеглым баку касьцёлу, па левы бок ад вялікага аўтара. Зьлева ад касьцёлу, насупраць капліцы Марыі, дойлід узьвёў падобную да яе капліцу, цяпер сьв. Уладзіслава, надаўшы ёй усярэдзіне авальную форму, як і ў капліцы Марыі. Звонку ж, каб не парушыць стыль, абклаў тыя дзьве капліцы мурамі ў квадрат. Пасоўваючыся на пэўнай адлегласьці ад капліцаў да касьцёлу, Гуцэвіч вымураваў дзьве бакавыя сьцены, раўналежныя старым касьцельным, і давёў іх з аднаго боку да капліцы сьв. Казімера, а з другога да закрыстыі. Да гэтых сьценаў дойлід дастасаваў усе бакавыя капліцы, зламаўшы іхныя даўнейшыя канцавыя сьцяны. Такім чынам ён надаў усім сьценам аднолькавую даўжыню і амаль што аднастайны выгляд.

НЕ ЗАЧАПІЎ ТОЛЬКІ КАПЛІЦЫ БЯЗГРЭШНАГА ЗАЧАЦЬЦЯ (ЦІ СТАРОЙ КАРАЛЕЎСКАЙ) — МАГЧЫМА, ТАМУ, ШТО НА СЬЦЯНЕ ЗА ВЯЛІКІМ АЎТАРОМ ФУНДАТАР ЗЬМЯСЬЦІЎ ПАГРОЗЬЛІВЫ НАДПІС: VIOLATOR HUIUS OPERIS INFELIX ESTO*; да таго ж шкада было нішчыць па-майстэрску зробленае купальнае скляпеньне ў некалькі ярусаў, аздобленае лепкаю з гіпсу і фрэскамі. ЗБОКУ АД НЕКРАНУТАЙ ТАДЫ СТАРОЙ КАРАЛЕЎСКАЙ КАПЛІЦЫ ПРАВЁЎ БАКАВУЮ СЬЦЯНУ, ШТО ЗЛУЧАЛА НЯДАЎНА ПАБУДАВАНУЮ ПЯРЭДНЮЮ КАПЛІЦУ ЗАКРЫСТЫЮ.

Урэшце, адступіўшы на пару сажняў ад новых нутраных сьценаў, Гуцэвіч паставіў з абодвух бакоў паміж пярэднімі ды тыльнымі капліцамі па каляннадзе. Фасадных вежаў ён не аднаўляў, але зрабіў шыкоўную прыбудову, якую падпіралі шэсьць велізарных калёнаў, а з другога боку — пярэдняя сьцяна галоўнага касьцельнага гмаху. Над прыбудоваю былі разьмешчаныя тры статуі: праваруч сьв. Казімера, леваруч сьв. Станіслава, пасярэдзіне — сьв. Галены з крыжам. Цыліндрычнае скляпеньне перадпакою было аздоблена разэтамі, фрызы — гіпсавымі адлівамі, якія месьціліся ў паглыбленьнях і выяўлялі касьцельны посуд і рыштунак да службы Божай. Карнізы на франтоне касьцёлу, на калёнах і пад застрэшкам зрабілі з абчасанага каменю, прывезенага з Брэмэну й з нашых Чабішкаў.

Выраўнаныя капліцы звонку з абодвух бакоў касьцёлу накрылі дахам, асобным ад галоўнага будынку. На застрэшкі абодвух бакавых дахаў паставілі мураваныя балюстрады з проймамі для сьцёку вады (вада адвеку была адным з ворагаў Віленскай катэдры, але аднойчы спрычынілася да важнага адкрыцьця — пра гэта ў наступным разьдзеле). Па-над гэтымі дахамі на трэць узвышаўся дах старога касьцёлу. Пярэдняя сьцяна зьверху была аздобленая скульптурамі Рыгі, прафэсара рымскай Акадэміі сьв. Лукаша: у вільчыку франтону паказана Ноева ахвяраваньне, ніжэй па баках статуі Масея і Абрама. У цэнтры разьмешчаны чатыры статуі сьвятых Эвангелістаў; над імі барэльефы, што выяўляюць падзеі з жыцьця апосталаў: казань сьв. Пятра, вылекаваньне хворага, сьмерць Ананія, вылячэньне хворага ў Лістры сьв. Апосталам Паўлам.

Што ж да нутранога выгляду катэдры, то, як сьведчыць неадменны яе летапісец Курчэўскі, Гуцэвіч, апрача кананічнага, узьвёў аўтар сьв. Станіслава, так званы «на скалцы» — на мейсцы даўнейшага вікарыеўскага. Вядома, што той даўнейшы аўтар сягаў аж да скляпеньня і складаўся з аўтара сьв. Станіслава зьнізу, далей узвышаўся двух'ярусны аўтар, што заканчваўся аблокамі пад самай стольлю. Пэўна, яны былі разбураныя, і таму Гуцэвіч замяніў іх новым аўтаром. Упрыгожыў ён вікарыеўскі аўтар гэтак: сьпераду зьмясьціў чатыры калёны ў дарычным стылі і насупраць іх — чатыры пілястры пры сьцяне; над імі збудаваў скляпеньне, абкружанае звонку карнізамі з трохкутным шчытом сьпераду; усё гэта размаляваў пад мармур: калёны й пілястры колерам вэрдэ-антыка, карнізы — белым, а аснову — шэрым, так званым чыпаліна; капітэлі калёнаў і пілястраў, выступы пад карнізамі і аздобы на фрызе — пазалацію. Пад гэтым аўтаром знаходзіцца невялікі склеп, куды даўней, відаць, складалі рэліквіі, а пад ахвярнікам у старых скрынях захоўваецца шмат рэліквіяў, хіба тых, што прывёз з Рыму кароль Аляксандар Ягайлавіч, а таксама пазьнейшых. У аўтары месьціцца абраз забойства сьв. Станіслава Баляславам Сьмелым пэндзля Францішка Смуглевіча. Гуцэвіч меў таксама намер абчасаць цяжкія прызматычныя калёны ў касьцёле і зрабіць іх круглымі паводле дарычнага ордэру, падобна да калёнаў «на скалцы» пры аўтары сьв. Станіслава; накрэсьліў плян хораў, што меліся стаяць на 16 слупах, аднак сьмерць перашкодзіла яму завершыць пачатае будаўніцтва і аздабленьне.



**Эвангеліст Марка** *(скульптура Т.Рыгі)*

**КНЯЗЬ БІСКУП ІГНАЦЫ МАСАЛЬСКІ БЫЎ ПЕРШАЮ АХВЯРАЮ «ЗАКЛЯЦЬЦЯ КАЗІМЕРА ЯГАЙЛАВІЧА» НА ПЕРАЛОМЕ СТАГОДЬДЗЯЎ?**

Наколькі пасьляхова спачатку разьвівалася будаўніцтва й рэстаўрацыя Катэдры, нагэтулькі бязрадасныя былі падзеі ў краіне, што і паўплывала на зьмізарненьне аздабленьня і запаволеньне аднаўленьня сьвятыні, — апавядае нам далей ксёндз Ян Курчэўскі. Галоўны фундатар біскуп Масальскі ня мог забясьпечыць належнымі сродкамі заканчэньне рэстаўрацыі, таму што праз выдаткі на патрэбу Рэчы Паспалітай ды іншыя траты, непазьбежныя ў ягоным сэнатарскім акружэньні, быў шмат каму вінаваты. На няшчасьце, ён распачаў судовы працэс з капітулаю, каб замяніць біскупскія Веркі на свой радзінны маёнтак Чырвоны Двор. Акрамя гэтага працэсу, капітула ўдзельнічала ў судовым разборы зь біскупам інфлянцкім Касакоўскім. Ён атрымаў ад Рыму прывілей на маёнткі Відзінішкі й Міхалішкі, што належалі канонікам, і, каб павялічыць нешматлікія прыбыткі свайго біскупства, учыніў збройны напад на манахаў ды выгнаў іх з кляштараў; больш таго, як прэлат-захавальнік віленскай капітулы, ён самавольна гаспадарыў у катэдральных маёнтках Пасволі і Жаймы. Усе гэтыя звадкі адцягвалі ўвагу капітулы ад Катэдры, а ўрэшце ад'езд біскупа Масальскага, якога ў 1788 г. выбралі камісарам на Чатырохгадовы Сойм, затрымаў распачатае аднаўленьне Катэдры.

Падзеньне Масальскага кінула на яго цень здрадніка Айчыны, якім ён ніколі ня быў. Не лічыўся з уласнымі грашыма, якімі яго шчодра забясьпечвалі радавыя маёнткі і віленскае біскупства, неабачліва выдаткоўваў грамадзкія грошы, пускаўся ў рызыкоўныя будаўнічыя пачынаньні, занадта дбаў пра славу й багацьце свае радні — гэта сапраўды так. Але тое, што старога, аслабелага сіламі й розумам чалавека зацягнула ў таргавіцкі вір, нельга разглядаць як ягоную сьведамую здраду. Бо ён жа любіў Айчыну, пра што сьведчыць ягоны чынны ўдзел у яе справах.

Гвалтоўная сьмерць біскупа настала не з прысуду, але ад рук разьюшанага натоўпу; сам Касьцюшка смуткаваў з прычыны ягонае сьмерці. Прах Масальскага аплаквала капітула і вернікі — жыхары Вільні, таму што хоць і дакаралі яго за маруднасьць у справе аднаўленьня замкавага касьцёлу і марнатраўства грошай, а ўсё ж любілі, як бацьку, за ласкавасьць і дабрыню сэрца.

Плакала капітула па сваім біскупе, стаяла ў жалобе незавершаная Катэдра.

Бывалі цяжкія часы для нашай Катэдры, але такіх яна яшчэ ня ведала. Адразу пазбавілася пастыра, каралёў, што яе песьцілі, шчодрага фундаваньня, а потым і будаўніка Гуцэвіча, які, засьпеты заўчаснаю сьмерцяй, пакінуў яе няскончанаю. Але апекаваліся Катэдраю Бог і сьв. Казімер і не далі ёй загінуць сярод страшэннага вынішчэньня й спусташэньня, дагэтуль нечуваных.

Так закончыў гаворку пра біскупа Масальскага і пра небывалую эпоху ў гісторыі першай сьвятыні ў Вільні высокашанаваны Курчэўскі: «БІСКУП ІГНАЦЫ МАСАЛЬСКІ НАСТОЙВАЎ, КАБ ГУЦЭВІЧ ПЕРАБУДАВАЎ І АДНАВІЎ СТАРУЮ КАРАЛЕЎСКУЮ КАПЛІЦУ».

* *Парушальнік хай будзе пракляты (лац.)*

**Пераклад Пятра РАГОЙШЫ**

*Далей будзе*



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

